МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ**

вул. Ракаўская, д. 17, 220004, г.Мінск
тэл./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк»
па г.Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ**

ул. Раковская, д. 17, 220004, г.Минск
тел./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»
по г.Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

22.10.2024 № 1-5/142

на № ____________ ад ____________

[redacted]

Аб разглядзе звароту

[redacted]

Упраўленне культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта разгледзела Ваш калектыўны электронны зварот ад 14.10.2024 № 29002400078418 па пытанні прысваення адной з вуліц горада імя народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча, паступіўшы ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, і ў рамках кампетэнцыі паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь «О наименованиях географических объектов» ад 16.11.2010 № 190-З (далей – Закон) прысваенне найменаванняў састаўным часткам г.Мінска (элементы вулічна-дарожнай сеткі і прыраўнаваныя да іх элементы горадабудаўнічай планіровачнай структуры) і іх перайменаванне ажыццяўляе Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

Артыкулам 20 Закона вызначана, што прапановы аб прысваенні найменаванняў састаўным часткам населеных пунктаў і іх перайменаванні могуць уносіць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі, а таксама грамадзяне пасля правядзення па гэтым пытанні мясцовага сходу або мясцовага рэферэндуму. Прапановы павінны ўтрыліваць абгрунтаванне неабходнасці прысваення найменавання або перайменавання.

Прапановы аб найменаванні састаўных частак г.Мінска, якія накіроўваюўцца ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, перадаюцца ў камісію па найменаванні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых састаўных частак г.Мінска (далей – камісія), створаную ў мэтах ажыццяўлення каардынацыі па фарміраванi адзінага падыходу да найменавання састаўных частак г.Мінска.

Пытанне аб прысваенні імя Ніла Гілевіча адной з вуліц у г.Мінску можа быць разгледжана камісіяй ва ўсталяваным заканадаўствам парадку пры наяўнасці зваротаў забудоўшчыкаў тэрыторый горада, адміністрацый

раёнаў г.Мінска, РУП «Мінскае гарадское агентства па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры», іншых арганізацый.

Дадаткова паведамляем, што імя Ніла Гілевіча ўключана ў спіс прапаноў па найменаванні новых вуліц сталіцы.

Дадзены адказ можа быць абскарджаны ў адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» у вышэйстаячай арганізацыі або ў судовым парадку.

Начальнік упраўлення К.П.Лучына

Лось 272 43 45

Тема **Упраўленне культуры МГВК**
От Отдел искусств управления культуры МГИК <oiuk@minsk.gov.by>
[redacted]
Дата 2024-10-22 12:27

- Прысваенне адной з вуліц г.Мінска імя Н.Плевіча.pdf(~57 КБ)